№ 9 (251)
ПЯТНІЦА
16
сакавіка
1956 года

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

ГАЗЕТА
ВЫДАЕЦЦА
з 1935 года

Цана 20 кап.

КОМСАМОЛЬСКАЕ ДАРУЧЭННЕ

— Слухай, Барыс,—звяртаецца групорг да студэнта,—мы рашылі табе даручыць прачытаць лекцыю на падшэфным прадпрыемстве. Вучышся ты добра, і даручэнняу комсамольскіх у цябе няма.

— Ды што ты, што ты! Лектара знайшоу! Няхай хто-небудзь другі,—адказвае Бора і, выкарыстаушы зручны выпадак, хаваецца у аудыторыі. Групорг толькі безнадзейна махнуу рукой і накіраваўся да Ігара Кільдышава. «Гэты не адмовіцца»,—падумау ён. Безумоўна, тут групорг пайшоу па найменшаму супраціуленню—пабаяўся сапсаваць адносіны з аднакурснікам.

Як ні шкада, але падобныя факты сустракаюцца на многіх курсах. Такая раунадушнасць, безадказнасць групорга прыводзіць да таго, што грамадскія даручэнні выконваюць заусёды адны і тыя-ж асобы, у той час як астатняя частка студэнтаў курса пасіўнічае.

Правільная арганізацыя і умелае размеркаванне грамадскіх даручэнняу садзейнічае паспяховай вучобе комсамольцаў; прыклады гэтага можна знайсці на кожным факультэце.

Зараз на IV курсе філалагічнага факультэта вучыцца Васілій Каленчыц. На працягу чатырох год ён вядзе вялікую грамадскую работу. Спачатку ён член комсамольскага бюро курса, групорг, а затым намеснік сакратара факультэцнага комсамольскага бюро. Грамадская работа не толькі не перашкаджае яму добра вучыцца, але наадварот, дапамагае. Васілій Каленчыц—Сталінскі стыпендыят.

Такіх студэнтаў ва універсітэце многа: Г. Герасіменка, В. Ціток (гістфак), Г. Шатэрнік, А. Хоміч (геафак), Н. Рожын, В. Макарэвіч (філфак) і іншыя. Але нельга мірыцца з той блытанінай і памылкамі, якія яшчэ назіраюцца пры размеркаванні і праверцы выканання даручэнняу.

Безумоўна, пры размеркаванні даручэнняу групорг павінен заусёды лічыцца з жаданнем комсамольцау. Бяда у тым, што у нашым асяроддзі яшчэ ёсць комсамольцы, якія, карыстаючыся гэтым, адмаўляюцца выконваць грамадскія даручэнні наогул. Групорг абавязан праявіць тут прынцыповасць і напомніць такому таварышу, што акрамя правоу, ва Уставе ВЛКСМ вызначаны і абавязкі комсамольца. Безумоўна, у такім выпадку таварышу патрэбна дапамагчы, параіць, а галоунае пракантраляваць выкананне. У грамадскай рабоце выпрацоуваюцца лепшыя комсамольскія якасці—настойлівасць, працавітасць, пачуццё таварыства.

Камітэт комсамола часта няправільна размяркоувае комсамольскія даручэнні на час канікул. Звычайна адбываецца так: у разгар экзаменацыйнай сесіі камітэт уручае сакратарам комсамольскіх бюро факультэтаў пачкі даручэнняу. Прычым, пуцёукі з даручэннямі без пячаткі, нікім не падпісаны, тэма лекцыі не указваецца. Камітэт выходзіць з таго, што комсамолец сам павінен выбраць тэму лекцыі. Гэта нядрэнна, безумоўна, калі студэнт мае магчымасць праявіць сваю ініцыятыву у выбары тэмы. Але адной ініцыятывы мала. Трэба дапамога. А яе, нажаль, у такіх выпадках няма. У гэтым годзе камітэт комсамола арганізаваў адзіную кансультацыю для студэнтау-лектараў аб міжнародным становішчы. Ды і гэта адзіная кансультацыя была сарвана па невядомых прычынах, а затым перанесена на другі дзень. У выніку такой неразбярыхі на кансультацыі прысутнічала нязначная колькасць студэнтаў.

Выкананне даручэнняу дрэнна кантралюецца. Усё абмяжоуваецца толькі зборам звестак з факультэтаў. Многія комсамольцы не выконваюць даручэнняу з года у год. А камітэт комсамола ніяк не знойдзе часу запытаць тых, хто бяздушна адносіцца да сваіх прамых комсамольскіх абавязкаў.

Да размеркавання даручэнняу і кантролю за іх выкананнем трэба адносіцца вельмі сур'ёзна. Толькі тады мы навучымся дакладна і аператыуна іх выконваць і зможам выпрабаваць на грамадскай рабоце кожнага комсамольца.

ПА УНІВЕРСІТЭТУ

Лекцыйныя заняткі па матэрыялах з'езда

На усіх факультэтах універсітэта вывучаюць матэрыялы XX з'езда КПСС. Заняткі праходзяць у плане лекцый з тым, каб студэнты маглі добра засвоіць важнейшыя задачы і пастановы з'езда.

Першая лекцыя была прачытана на II курсе юрыдычнага факультэта дацэнтам Саладковым. Лектар спыніуся на значэнні гэтан вялікаи гістарычнай падзеі у жыцці усяго чалавецтва. Потым дау змястоунае тлумачэнне міжнароднага становішча СССР па справаздачнаму дакладу ЦК КПСС.

Студэнты сур'ёзна аднесліся да заняткаў, уважліва слухалі лекцыю.

Р. ВАЙЦЕНКОВА.

У гуртку беларускага фальклора

Цікавая работа вядзецца у гуртку па вывучэнню і збіранню беларускага фальклора (кіраунік кандыдат філалагічных навук Д. П. Багрова). Гурткоуцы узяліся за распрацоўку тэм, звязаных з вуснай народнай творчасцю. Так, днямі студэнтка I курса філалагічнага факультэта Л. Гурэвіч зрабіла даклад на тэму «Беларуская народная лірычная песня».

Члены гуртка карыстаюцца не толькі вядомымі матэрыяламі, але і спрабуюць свае сілы ў этнаграфічнан рабоце. На пасяджэнні абмяркоувалі народныя казкі, песні, загадкі, запісаныя на Палессі студэнтам I курса аддзялення журналістыкі Б. Сачанка. Сярод вядомых песень і казак сустракаліся розныя варыянты.

На наступным пасяджэнні будуць абмяркоуваца запісы гурткоуца В. Дашука.

П. КАЗАЧОНАК

СТУДЭНТЫ РАСПРАЦОУВАЮЦЬ ВАЖНЫЯ ТЭМЫ

Добра будуе сваю работу гурток пошукавай разведчай справы на геолага - геаграфічным факультэце. На пасяджэннях гурткоуцы чытаюць свае навуковыя даклады, якія маюць практычнае значэнне.

Нядауна студэнт IV курса Фелікс Сяргейчык прачытаў даклад «Геобіяхімічныя спосабы пошукаў месцанараджэнняу золата». За распрацоўку гэтай тэмы ён узяуся з усёй сур'ёзнасцю, а таму і даклад атрымаўся змястоуны.

Нядрэнна справіліся са сваімі работамі студэнткі III курса Драздоуская і Сплашнова, якія зацікавіліся роллю хімічных рэагентаў у паляпшэнні гліністых растворау і метадамі прыгатавання гэтых растворау.

Даклад аб методыцы разведкі хромістых месцанараджэнняу і аб геахімічных метадах пошукаў медзі зрабілі студэнты IV курса Кузняцоу і Берлін.

Я. ГОМАН.

Лепшыя работы— на гарадскі агляд

На біялагічным факультэце працуе 9 гурткоу, у тым ліку гурткі гідрабіялогіі, мікрабіялогіі, глебазнаўства, заалогіі і іншыя. У іх займаецца больш 100 чалавек.

Зараз у гуртках вядзецца падрыхтоўка студэнцкіх навукова-даследчых работ да гарадскога агляду. Кожны гурток прадстаўляе на агляд усё лепшае, што было зроблена яго членамі. На аглядзе будуць прадстаулены работы студэнткі V курса Чэрэнкевіч «Уплыу мінскай лячэбнай мінеральнай вады на сакрэтную функцыю ізаляванага, па Паулаву, жалудачка» студэнткі IV курса Чыкілеускай «Хімічныя метады барацьбы з драцянікам на кукурузе», студэнткі Картажыцкай «Змена раслінных асацыяцый у пойме ракі Нораў у Белавежскай пушчы» і інш.

Распрацаваныя ў работах праблемы маюць вялікае практычнае значэнне.

Усяго на гарадскі агляд будзе прадстаўлена каля 40 навукова-даследчых работ студэнтаў.

Н. ДАРАШЭНКА.

СЕМІНАР, ПРЫСВЕЧАНЫ ПАМЯЦІ Н. І. ЛАБАЧЭЎСКАГА

У гэтым годзе сусветная навуковая грамадскасць адзначае 100-годдзе з дня смерці выдатнага рускага вучонага Н. І. Лабачэускага. 10 сакавіка у вялікай фізічнай аудыторыі фізмата адбыуся агульнагарадскі матэматычны семінар, прысвечаны памяці вялікага рускага геаметра Н. І. Лабачэускага. У 17 гадзін сюды прыйшлі вучоныя-матэматыкі універсітэта, політэхнічнага і педагагічнага інстытутау і іншых вышэйшых навучальных установ горада.

З дакладам аб жыцці і актыунай творчай дзейнасці Н. І. Лабачэускага выступіу дацэнт Л. К. Тутаеў. Ён адзначыу, што вялікая навуковая спадчына і грамадская дзейнасць вучонага, нажаль, яшчэ далёка не вывучаны і чакаюць сваіх даследчыкаў. Тав. Тутаеу падрабязна спыніуся на дзіцячых і юнацкіх гадах Лабачэускага і адзначыу, што вельмі цікавай і важнай крыніцай па гэтаму пытанню з'яуляецца «Сямейная хроніка» С. Аксакава. Далей дакладчык расказаў аб вучобе будучага геаметра у Казанскім універсітэце, аб яго навуковых працах і іх уплыве на сучаснікау і асабліва аб кіпучай высокароднай дзейнасці Н. І. Лабачэускага на пасадзе рэктара універсітэта. Н. І. Лабачэускі прабыу на гэтай пасадзе 18 гадоу. Пад яго уплывам Казанскі універсітэт стау светачам сусветнай навукі.

Дацэнт А. Н. Нахімоуская выступіла з дакладам «Развіццё ідэй геаметрыі Н. І. Лабачэускага». Яна адзначыла асаблівую арыгінальнасць геаметрыі вялікага вучонага і яе жыватворчы уплыу на далейшае развіццё геаметрыі і усёй матэматыкі.

Кандыдат фізіка-матэматычных навук А. С. Фядзенка прачытау даклад «Роля ідэй Н. І. Лабачэускага у сучаснай фізіцы». Тав. Фядзенка падкрэсліу матэрыялістычны погляд выдатнага геаметра на прастору і час. Пункт гледжання Н. І. Лабачэускага быу наяунай процілегласцю ідэалагічным поглядам Н'ютона па гэтаму пытанню.

Усе даклады былі прачытаны жыва і цікава. Дакладчыкі адказалі на пытанні студэнтаў і навуковых работнікаў

В. БАЦЬКОЎ.

КАШТОЎНАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

Каштоуную ініцыятыву праявіла дацэнт кафедры геаметрыі тав. А. Н. Нахімоуская, прачытаушы на II курсе аддзялення матэматыкі лекцыю на тэму «Градыент скалернага поля» на англійскай, французскай і нямецкай мовах. Нягледзячы на тое, што тэма лекцыі была незнаёмай для студэнтаў, яны зразумелі яе і перадалі змест. Студэнты з вялікай цікавасцю праслухалі лекцыю і былі вельмі удзячны лектару. Яны пераканаліся у тым, што разумеюць гутарку на замежнай мове, і каб быць высокакваліфікаванымі спецыялістамі, умець чытаць і разумець літаратуру на замежнай мове, яны павінны яшчэ больш сур'ёзна працаваць над яе вывучэннем.

Тав. Нахімоуская заусёды аказвае дапамогу выкладчыкам замежных моу у падборы матэрыялаў па спецыяльнасці і дае кансультацыі па перакладу яго. Лічым, што гэта каштоуная ініцыятыва павінна быць падтрымана работнікамі вядучых кафедр усіх іншых факультэтаў.

Т. КАВАНАВА.

Настойліва павышаць палітычны ўзровень

У бягучым навучальным годзе значна пашырылася сетка гурткоу па вывучэнню марксізма-ленінізма, гісторыі партыі, бягучай палітыкі. Многія члены профсаюза—супрацоунікі універсітэта—настойліва павышаюць свой палітычны узровень. Большасць членау актыуна наведвае заняткі гурткоу, выступае з дакладамі, задае пытанні і дапауняе дакладчыкау па таму або іншаму пытанню.

Аднак ёсць ва універсітэце яшчэ і такія таварышы, якія абыякава адносяцца да павышэння свайго ідэйнага узроуню. Так, напрыклад, некаторыя таварышы не наведваюць заняткі, а іншыя наведваюць іх вельмі рэдка, па аднаму — два разы за поугоддзе. Сярод асабліва нядбайных членау профсаюза, якія зусім не наведваюць заняткі, трэба адзначыць тав. Пільмана (профарганізацыя гістарычнага факультэта), тав. Янушэускую (профарганізацыя філалагічнага факультэта), тт. Песткоускую, Табула (профарганізацыя адміністрацыйна-гаспадарчай часткі). Дрэнна наведваюць заняткі тт. Юн'еу (профарганізацыя біяфака), Ткачоу, Чэрнабай, Баскіна (профарганізацыя юрыдычнага факультэта), Актынава, Малая, Мурашка, Мацюк (профарганізацыя адміністрацыйна-гаспадарчай часткі) і рад іншых.

Недобрасумленна наведваюць Універсітэт марксізма-ленінізма многія выкладчыкі універсітэта. Так, т. Шлапакова з 13 заняткаў прапусціла 10, т. Марцынкевіч прапусціла 7 заняткау, Клебановіч—11 заняткау. Можна назваць яшчэ прозвішчы іншых таварышаў. Іх нямала.

Гэтыя факты гавораць аб тым, што да заняткаў адносяцца абыякава як самі члены профсаюза, так і тыя профсаюзныя арганізацыі, у склад якіх уваходзяць гэтыя таварышы.

У сучасны момант партыя ад імя XX з'езда КПСС паставіла задачу значнага паляпшэння ідэалагічнай работы. Недахопы, якія маюць месца у нашай рабоце, трэба выкараніць у найкарацейшы тэрмін. Усе члены профсаюза павінны актыуна наведваць заняткі па вывучэнню марксізма-ленінізма, павышаць свой ідэйна-палітычны узровень.

А. С. ЛАКІЗА.

КАРОТКА

Члены гуртка эканамічнай геаграфіі на адным з сваіх пасяджэнняу праслухалі і абмеркавалі даклады студэнтак V курса Каралёвай і Угрумавай аб эканамічна-геаграфічнай характарыстыцы горада Віцебска, а таксама Грэскага раёна. Пасля студэнт III курса Меероускі зрабіу паведамленне аб геаграфічных навінах.

★

Студэнты хімічнага факультэта праслухалі лекцыю аб штучным спадарожніку Зямлі і аб міжпланетных падарожжах. Гэтую лекцыю прачытаў дацэнт тав. Пахута.

★

Днямі у ленпакоі інтэрната корпуса «А» студэнт V курса аддзялення журналістыкі Лунін прачытаў лекцыю на тэму: «Шышкін—пясняр рускага леса», якую з цікавасцю праслухалі студэнты.

★

На геолага-геаграфічным факультэце выпускаецца цікавая газета «Навіны дня». Яна выходзіць штодзённа і асвятляе усё, што адбылося на факультэце за дзень.

★

Студком інтэрната па вуліцы Няміга прэміраваў нядауна лепшыя пакоі за узорны парадак. Патэфонам з пласцінкамі прэміраван пакой № 2 (староста А. Гусева), шашкамі і даміно—пакой № 18 (староста Т. Барысевіч). Прэміраваны таксама пакой № 5 (староста Е. Васільеу) і іншыя.

„...ПРАФЕСІЯ НАСТАЎНІКА Ў НАШАЙ КРАІНЕ—АДНА З САМЫХ ПАЧЭСНЫХ. НАСТАЎНІК—ГЭТА ВЫХАВАЦЕЛЬ ВУДУЧЫХ БУДАЎНІКОЎ КОМУНІСТЫЧНАГА ГРАМАДТСВА"

(Н. А. БУЛГАНІН. Даклад на XX з'ездзе КПСС)

★ ★ ★

У ДОБРЫ ЧАС!

У пачатку лютага ў школу № 9 прышло 11 студэнтаў IV курса фізіка-матэматычнага факультэта БДУ вучыцца педагагічнай справе. Школа прыняла іх гасцінна. Усе іі аказаліся людзьмі цікаўнымі, вельмі сур'ёзнымі і добрасумленнымі.

Дырэкцыя падрабязна пазнаёміла практыкантаў з работай школы, з яе асноўнымі задачамі. Студэнтам далі разгорнуты план іх працы.

Больш тыдня ішла пасіўная практыка: студэнты, наведваючы урокі, уважліва прыглядаліся да метадаў работы вопытных педагогаў. Але надыйшоў час і актыўнай практыкі. Прадбачачы магчымасці непрыемных сюрпрызаў на першых самастойных уроках, метадыст і настаўнік патрабавалі ад будучых выкладчыкаў самы падрабязны канспект кожнага прадстаячага урока.

Даны першыя урокі. Непрыемных сюрпрызаў няма. Студэнтка звычайна выходзіць з класа расчырванеушаяся, з усмешкай на твары, якую я бачыў у малых дзяцей, зрабіўшых першыя крокі без пабочнай дапамогі.

Наступныя урокі пайшлі лягчэй, і голас неяк спакайней, і поступ больш упэўнены. Практыка ідзе да канца. Студэнты пазнаёміліся з усімі відамі урокаў курса матэматыкі сярэдняй школы, таксама яны складалі кантрольныя работы, праводзілі і правярялі іх, пазнаёміліся з элементамі політэхнічнага навучання, з работай класнага кіраўніка. Кожная з практыкантак дапамагала класнаму настаўніку.

Падагульняючы праробленую работу, трэба адзначыць, што усе урокі праведзены на высокім узроўні. Гэта гаворыць аб тым, што тэорыя і методыка матэматыкі засвоены студэнтамі фізмата БДУ трывала.

Але трэба адзначыць, што калі ў тэорыі аналітычных пераўтварэнняў практыканты адчуваюць сябе зусім свабодна, то ў геаметрыі і, асабліва стэрэаметрыі, гэтага няма. Не на належным узроўні у іх і пытанне з чарчэннем і мадэліраннем.

Трэба, каб дэканат фізмата паклапаціўся аб ухіленні гэтых недахопаў. Акрамя таго, я хачу напомніць, што выпускнікі фізмата БДУ 1930 года ведалі геадэзію і трактаразнаўства з практычнай работай на полі, што, на мой погляд, трэба увесці і зараз у сувязі з політэхнізацыяй навучання.

Я спадзяюся, што праходзіўшыя практыку у нашай школе студэнты будуць нядрэннымі выкладчыкамі матэматыкі. Трэба толькі памятаць, што кожнаму настаўніку, нягледзячы ні на які стаж і падрыхтоўку, трэба рыхтавацца самым старанным чынам да кожнага уроку. Трэба памятаць, што, калі чалавек узяўся вучыць другіх людзей, сам ён у першую чаргу павінен няспынна і сістэматычна павышаць сваю кваліфікацыю, не думаючы, што універсітэт дау яму на усё жыццё усе патрэбныя веды.

Шчаслівага шляху!

М. Г. ГАДЫЦКІ,
выкладчык матэматыкі сярэдняй школы № 9, г. Мінска.

РЫХТУЮЧЫСЯ ДА БУДУЧАЙ РАБОТЫ

Да практыкі усе мы, чацвёракурснікі, рыхтаваліся яшчэ загадзя: прачыталі шмат дадатковай літаратуры па методыцы выкладання, па выхаваўчай рабоце і педагогіцы. І усё-ж я не магла уявіць сябе на месцы настаўніка.

Першы ў жыцці самастойна праведзены урок... Як ні стрымліваеш сябе, нельга не хвалявацца, хоць складзен падрабязнейшы план урока з пытаннямі да вучняў, з паметкамі, што зрабіць і што сказаць. Аднак усё-ж здаецца, што нешта упушчана. І калі я увайшла у клас, настолькі разгубілася, што у першы міг не бачыла у журнале лінеек, каб адзначыць адсутнічаючых. Але потым паглядзела на клас, сустрэлася з чакаючымі і дапытлівымі вачыма вучняў—і крыху супакоілася. Урок прайшоў добра і быў ацэнен на «выдатна».

Многа цікавых урокаў правялі мае таварышы: Нікалаева, Савасцюк, Куніэвіч, Нікіціна, Пугачова і многія іншыя.

Уся наша група вельмі удзячна выкладчыку матэматыкі дзевятай школы Гадыцкаму М. Г., які працуе настаўнікам 35 год і мае вялікі вопыт. Міхаіл Грыгоравіч праводзіў з намі гутаркі, раіў, як лепш падаць новы матэрыял вучням, актывізаваць клас. Вялікую дапамогу у педпрактыцы аказаў нам і дацэнт Л. К. Тутаеу.

Хочацца сказаць і аб цяжкасцях, з якімі я і мае сяброўкі сустрэліся у час работы у школе.

Першы урок я давала у 9-м класе па стэрэаметрыі. Галоўнае у падачы матэрыяла—правільна і выразна зрабіць чарцёж, каб вучні ясна змаглі уявіць размяшчэнне фігуры у прасторы. Вось тут я і сустрэлася з цяжкасцю у пабудове чарцяжа. Школьны курс чарчэння за гады забыўся, а ва універсітэце яго не выкладаюць, хаця для выкладчыкаў матэматыкі ён вельмі важны і патрэбны.

Хацелася-б яшчэ, каб на фізмаце была уведзена элементарная матэматыка, якая вельмі дапаможа у будучым, калі мы станем настаўнікамі.

Практыка дала нам вельмі многа, і мы спадзяемся, што калі прыдзем у школу на працу, будзем адчуваць сябе упэўнена.

З. ПАХІЛЬКА,
студэнтка IV курса фізіка-матэматычнага факультэта.

Практыка нас многаму навучыла

У сувязі з тым, што большасць біёлагаў пасля заканчэння універсітэта ідзе працаваць у школу, педагагічнай практыцы у школе удзелена вялікая ўвага.

У гэтым годзе мы, студэнты IV курса, упершыню пазнаёміліся з педагагічнай і выхаваўчай работай у школе.

Дырэкцыі школ і настаўніцкія калектывы вельмі добра прымаюць студэнтаў на практыку. Яны даюць каштоўныя парады, дзеляцца сваім вопытам.

Наша практыка заключалася у тым, што мы наведвалі і абмяркоўвалі урокі выкладчыкаў і сваіх таварышаў. Нам трэба было даць адзін заліковы урок. Аднак, многія студэнты далі па 2—3 урокі (Гарачка, Беражная, Высоцкая, Розенцвайг, Жылінская і інш).

Студэнты старанна рыхтаваліся да урокаў, выкарыстоўвалі наглядныя дапаможнікі. Таму ўрокі праходзілі вельмі цікава.

Пазнаёміліся мы і з выхаваўчай работай. Кожны студэнт быў прымацаваны да якога-небудзь класа класным кіраўніком. Студэнты праводзілі палітінфармацыі, гутаркі, удзельнічалі у правядзенні вечароў і выпуску насценных газет, праводзілі класныя і камсамольскія сходы.

Гэта практыка дала нам яснае уяўленне аб нашай будучай рабоце.

Н. БАГАШЭВА.

„Навуковае кіраўніцтва" дацэнта...

Становішча, якое склалася у студэнцкіх навукова-даследчых гуртках на многіх кафедрах факультэтаў, узбуджае законную трывогу у вучэбнай часткі і партыйных арганізацыях факультэтаў. Гэтая важная справа доўгі час была пушчана на самацёк і вялася зусім нездавальняюча. Як вынік, значна паменшыуся ў параунанні з мінулым годам лік студэнтаў, занятых у гуртках, а колькасць прачытаных дакладау складае цяпер менш адной трэці. Пры гэтым, з усіх 139 прачытаных дакладау 75 прыпадае на біёлага-глебавы факультэт.

На першы погляд здавалася, што навукова-даследчая работа сярод студэнтаў наладзіцца, бо на чале гурткоу сталі лепшыя сілы з прафесарска-выкладчыцкага складу. Нажаль, на многіх факультэтах справа пайшла далёка не так.

Возьмем геолага-геаграфічны факультэт. Многія удзельнікі гуртка кафедры геахіміі карысных выкапняу, якім кіруе дацэнт П. С. Самадураў, ужо забыліся, калі у іх было пасяджэнне.

— Не памятаю добра, але, здаецца, адно было,—гаворыць старшыня совета СНТ факультэта І. Ур'еу. Ён доуга корпауся у сваёй запісной кніжцы і, нарэшце, знайшоу дату першага арганізацыйнага пасяджэння. Гэта было 5 лістапада мінулага года.

Тое-ж самае пацвярджае і староста гуртка Ул. Салагуб.

— А маглі-б збірацца кожны тыдзень,—зазначае ён.

На пытанне, што-ж перашкаджае рабоце, можа няма добрых навуковых кіраўнікоу, тав. Салагуб адказвае:

— Наадварот. Кіраўнікі добрыя, ведаюць сваю справу, але работы чамусьці няма. Відаць, не хочуць перадаць нам свой вопыт.

У гурток запісалася звыш 30 студэнтаў. Большасць з іх набылі у перыяд вытворчай практыкі на Урале, у Прыдняпроуі і пры вывучэнні фауны Беларусі багатыя матэрыялы для навуковых распрацовак у гуртку. Гурткоуцы самі прапанавалі цікавыя тэмы для дакладау і з ахвотай браліся за іх ажыццяўленне.

Можна было чакаць, што гурток геахіміі карысных выкапняу правядзе значную навуковую работу. Апрача П. С. Самадурава, кіраваць падрыхтоўкай студэнцкіх работ узялася выкладчыца кафедры С. Г. Драмашка. Але ішоу час, хутка кіраўнікі забылі сваіх гурткоуцаў. А калі староста звяртауся да таварыша Самадурава, апошні указваў:

— Звярніцеся лепш да Святланы Грыгорауны. Няхай яна з вамі зоймецца. У яе больш часу.

Святлана Грыгорауна у сваю чаргу адказвае:

— Няхай лепш Пётр Сямёнавіч зоймецца. Ён-жа кіраунік гуртка.

Такім чынам, пакуль Пётр Сямёнавіч указваў на Святлану Грыгорауну, а Святлана Грыгорауна на Пятра Сямёнавіча, гурткоуцы бяздзейнічалі і страцілі цікавасць да гуртка. Нават работа студэнта 4 курса Р. Крывадубскага аб мінералах і адкладаннях горада Мінска, якая напісана яшчэ у мінулым навучальным годзе, і да гэтага часу не прачытана.

Сам-жа П. С. Самадураў знаходзіць для адказу дзесяткі «аб'ектыўных і неаб'ектыўных» прычын.

— Занятасць, — разводзіць ён рукамі.—То студэнты заняты, то выкладчыкі. А колькі турбот з недахопам аудыторый! Ды ці мала можна знайсці прычын?

Сапрауды, нельга не згадзіцца тут з тав. Самадуравым, што ні мала можна знайсці прычын, каб апраўдаць сваю бяздзейнасць!

Вядома, што партыйная арганізацыя геафака, асабліва у апошні час, занепакоена дрэннай абстаноукай у рабоце студэнцкіх гурткоу. На партыйным бюро не раз абмяркоувалися гэтыя пытанні. Як паведаміу сакратар партыйнай арганізацыі факультэта тав. Карулін, партбюро вырашыла яшчэ 21 лютага правесці нараду навуковых кіраўнікоу і старост гурткоу. На нараду сабраліся старасты і некаторыя студэнты. Не з'явіліся толькі навуковыя кіраўнікі, хаця ім былі уручаны асобыя запрашальныя білеты і неаднаразова яны папярэджвалися вусна. Тым больш, гэтым мерапрыемствам менш за усё цікавіцца тав. Самадураў.

Прауда, тав. Самадураў у апошні час рашыу задумацца над гэтым пытаннем.

— Трэба абавязкова сабрацца,—разважае ён,—у нас ёсць даклады. Так і быць—на гэтым тыдні!

Праз некалькі дзён Пётр Сямёнавіч зноу раскайваецца:

— Эх, шкада, нельга сабрацца на гэтым тыдні! Ну нічога! У будучы панядзелак, 12 сакавіка, у сем гадзін вечара абавязкова сабярэмся. Прыходзьце, паглядзіце.

Мы рашылі пабываць на пасяджэнні гуртка. Нажаль, у вызначаны час ні тав. Самадурава, ні гурткоуцау тут нават і блізка не аказалася. На кафедры паведамілі, што ён наогул не паказваўся у гэты дзень ва універсітэце. Відаць, Пётр Сямёнавіч проста пусціу сваё абяцанне на вецер.

Нажаль, навуковы гурток пры кафедры геахіміі карысных выкапняу не адзіны ва універсітэце у сваёй бяздзейнасці. Амаль такое становішча у гуртках пры кафедры асноу марксізма-ленінізма, якім кіруе дацэнт В. І. Мацко, пры кафедры тэорыі і практыкі партыйнага і совецкага друку, якім кіруе дацэнт М. С. Зярніцкі. Дрэнна пастаулена справа з работай навуковых студэнцкіх гурткоу на юрыдычным факультэце.

Кіраунікі некаторых гурткоу гоняцца за колькасцю дакладаў, якія можна выставіць на агульнауніверсітэцкі і гарадскі агляд. Яны часта набываюць такія даклады з курсавых, дыпломных работ і толькі не з самастойных прац, напісаных студэнтамі у гуртку. Такой практыкай асабліва не варта захапляцца на кафедрах грамадскіх навук, бо тут не цяжка падрыхтаваць патрэбныя работы са студэнтамі непасрэдна ў гуртках.

Як відаць, не на вышыні у гэтым годзе і совет СНТ. Яго кіраунікоу чамусьці мала турбуе аставанне гуртковай работы.

Да канца вучэбнага года засталося не так ужо многа часу, а наяўныя лічбы і факты у рабоце гурткоу далёка не заспакойваючыя. Пры такіх умовах універсітэт можа заняць значна ніжэйшае месца у параўнанні з мінулым годам на гарадскім агляддзе студэнцкіх навуковых работ. Вельмі крыудна, што гэтае ненармальнае становішча склалася іменна цяпер, калі гістарычныя рашэнні XX з'езда партыі паставілі перад совецкай навукай новыя грандыёзныя задачы, калі ад вышэйшай школы патрабуецца выпускаць спецыялістаў з больш шырокім светапоглядам, творчай актыунасцю і высокай адукаванасцю.

Ул. ХМЯЛЬНІЦКІ.

ПЕРШЫЯ РАДАСЦІ

Было ужо за поунач, але студэнты IV курса гістфака Януш Дэрч і Жэня Вашкевіч не спалі. Сур'ёзныя, задумаушыяся, сядзелі яны над раскрытымі дапаможнікамі і канспектамі. Часам раіліся між сабой, спрачаліся, даказвалі адзін другому, а потым зноу чытали. І калі усё было зроблена, хлопцы яшчэ доуга сядзелі моучкі, схіліўшыся над сталом і штосьці абдумвалі.

— А ведаеш, Жэня,—парушыу маучанне Януш,—я вельмі рад, што выбрау прафесію педагога. Вось заутра педпрактыка, урок буду даваць, а мне нікольк не страшна, нават радасна. Вось уяулю сябе сярод вучняу, вясёлых, жыццёрадасных, і на сэрцы становіцца неяк святлей і цёпла, цёпла.

— А мне, ты думаеш, не радасна,—адказау Жэня.—Я вось толькі баюся, што не спраулюся. Надзвычай адказная гэта справа.

...Януш прылёг на ложак, але доуга не мог заснуць. Думкі роем кружыліся ў яго галаве. Прыпаміналася дзяцінства. школа і, нарэшце, універсітэт. Многа падзей адбылося ў яго жыцці за гэты час. А заутра да іх далучыцца яшчэ адна, самая важная...

Назаутра хлопцы прышлі у школу яшчэ за поугадзіны да званка. Моучкі расхаджвалі яны па калідоры, размаулялі, нават жартаваць спрабавалі. Але ні адзін, ні другі не маглі скрыць свайго хвалявання. Жэня час-ад-часу паглядваў на гадзіннік, Януш часта спыняуся, доуга глядзеу у акно, потым пачынау хутка хадзіць узад і уперад.

— Хвалюешся? — запытаў яго Жэня.

— А ты?

— Хвалююся.

...Першы званок застау іх у настаўніцкай.

Да юнака падышоў кіраўнік групы Гелій Маркавіч. Ён ласкава паклаў яму руку на плячо, другой падау указку і класны журнал.

— Вось, трымай,—ціха сказау ён,—толькі не хвалюйся. Мне даручы гэта.

Ён моцна паціснуу Янушу руку, і той пайшоу па калідоры... 8«б», 9«в», 7«а». А вось і 7«б». Януш спакойна адчыняе дзверы і заходзіць у клас. Вучні устаюць. Юнак упэунена падыходзіць да стала, раскрывае журнал.

— Хто адсутнічае? Няма такіх? Вось і добра.

Ён на момант акідвае вокам клас. Цішыня, пытлівыя позіркі хлапчукоу і дзяучынак, цёплая, ледзь бачная усмешка на твары Гелія Маркавіча... Цяпер ужо Януш не хвалявауся.

— Праверым дамашняе заданне,—спакойна сказау ён.—Першае пытанне: «Умацаванне абсалютызма у Францыі пры Людовіку IV».—І, паглядзеушы у журнал, дадау:—Адказваць будзе Шагалаў.

Невысокага росту хлопчык падняуся з-за парты, падышоу да дошкі і спакойна, упэунена пачау гаварыць. Януш слухау яго з асаблівай увагай, і калі той скончыу, сказау з задавальненнем:

— Урок ведаеш вельмі добра. Малайчына.

Януш хацеу ужо ставіць адзнаку, але раптам спыніуся і запытау:

— А калі была грамадзянская вайна у Францыі?

— Грамадзянская вайна у Францыі,—бойка пачау хлапчук, але далей спыніуся, пачырванеу і апусціу вочы.

— Не ведаю,—прызнауся ён.

— Хто адкажа? — звярнуся Януш да класа. І калі на пытанне быу дадзен належны адказ, ён падышоу да Шагалава:

— Ну, што ты. Урок выдатна ведаеш, а мінулага вось не паутараеш. Сядай! Чатыры. Потым адказваюць вучні Лапідус і Кручкова .А за імі Януш тлумачыць новы матэрыял. Ён гаворыць выразна, спакойна, а думка, што яго не разумеюць, хвалюе Януша. Але хутка юнак ужо не думау аб гэтым. Ён бачыу, што вучні слухаюць яго з надзвычайнай цікавасцю. І на кожнае пытанне, паставленае у ходзе тлумачэння, хорам даюць правільныя адказы.

— Разумеюць. Значыць дахадзіць,—з радасцю думау Януш, ад гэтага яму станавілася неяк лягчэй, і ён гаварыу яшчэ больш упэунена і спакойна.

Урок закончан. Януш выходзіць у калідор. Там яго ужо чакау Гелій Маркавіч.

— А, вось ты, арол,—загаварыу ён.—Малайчына... Парадаваў мяне...

І ён моцна паціснуу руку будучаму настаўніку, потым ласкава, па-бацькоуску прытуліу да сябе. Януш нават разгубіуся ад шчасця. Яму хацелася сказаць у адказ штосьці ласкавае, цёплае, але не ведау, з чаго пачаць.

— Дзякую... Дзякую, Гелій Маркавіч.., За усё, за усё,—нарэшце сказау ён. Гелій Маркавіч усміхнууся, злёгку пахлопау яго па плячу, і яны пайшлі.

Януш ніколі не забудзе гэтага дня. Можа упершыню у жыцці ён па-сапраўднаму зразумеу тады, якая адказная гэта справа быць педагогам. Часта ён задумваецца аб сваім будучым, у прыгожых фарбах малюючы сваю працу ў школе. І няхай гэта пакуль што толькі яшчэ мары, але мары гэтыя збудуцца.

В. САЛАНОВІЧ.

У НАГУ З ЖЫЦЦЁМ

Кафедра заалогіі біёлага-глебавага факультэта уключае у свой склад як заолагаў па пазваночных жывёлах, так і спецыялістаў па заалогіі беспазваночных, якія ў нашым універсітэце вядуць даследчую работу галоўным чынам у галіне гідрабіялогіі. Адпаведна з гэтым і даследчая работа кафедры звязана з запатрабаваннямі народнай гаспадаркі ў некалькіх рознастайных напрамках.

Так, напрыклад, заолагі пазваночных шмат увагі ўдзяляюць вывучэнню грызуноў. Такая работа вядзецца таму, што грызуны значна закранаюць інтарэсы чалавека. З аднаго боку, многія з іх з'яўляюцца небяспечнымі шкоднікамі сельскагаспадарчых культур і служаць пераносчыкамі узбуджальнікаў хвароб (тулярэмія і інш.). З другога боку, мышавідныя грызуны—корм для многіх промысловых жывёл, і у гэтых адносінах іх значэнне станоўчае.

Адсюль ясна, наколькі важна вывучэнне жыцця і размнажэння грызуноў ва умовах Беларусі. Вырашэннем названай задачы займаецца праф. І. Н. Сержанін. Актыуны удзел у гэтай-жа рабоце прымае і старшы лабарант В. В. Слесарэвіч, які мае вялікі вопыт вывучэння наземных пазваночных.

Распрацоука тэмы патрабуе летніх экспедыцыйных і поўстацыянарных даследаванняў, якія праводзяцца ў садружнасці з інстытутам мікрабіялогіі і гігіены, зацікаўленым у вывучэнні мышавідных грызуноў як распаўсюджвальнікаў тулярэміі. Аспірант кафедры Ю. Т. Пятроускі ў цеснай сувязі з аддзелам абароны раслін Міністэрства сельскай гаспадаркі праводзіць вывучэнне біялогіі распаусюджвання і эфектыунасці мер барацьбы з крапчатым суслікам, які у некаторых раёнах БССР сустракаецца у значнай колькасці і прыносіць істотную шкоду пасевам збожжавых.

XX з'езд КПСС у Дырэктывах па шостай пяцігодцы прадугледзеу развіццё вялікіх работ па асушэнню і асваенню Палесся. Рэгуляванне стоку вод Палесся павінна суправаджацца стварэннем вялікіх водасховішчаў. У сувязі з гэтым паустала неабходнасць вывучэння вадаёмау Палесся. Летам 1953 года універсітэтам была арганізавана вялікая комплексная экспедыцыя па вывучэнню вадаёмау Беларускага Палесся. Вынікі работ экспедыцыі былі падагулены на спецыяльнай канферэнцыі ў маі 1954 года і у хуткім часе выйдуць у свет у выглядзе зборніка прац экспедыцыі. Вывучэнне вадаёмау Палесся ў 1954 і 1955 гадах прадаужалася пад кіраўніцтвам дац П. Г. Пятровіча, які арганізаваў спецыяльныя выезды на раку Пціч, Ясельду і на палескія азёры.

Пачынаючы з 1950 года наша кафедра сумесна з кафедрай фізіялогіі раслін праводзіла работу па вывучэнню біялагічных асноу дзеяння мінеральных угнаенняу у сажалкавых гаспадарках. Работы гэтыя, у якіх прымаў удзел аспірант В. І. Гапоненка і многія студэнты, прывялі да важнага для практыкі вывада, што наперакор пануючым уяўленням ва умовах БССР нельга абмяжоуваццa толькі фосфарнымі ўгнаеннямі, а неабходна прымяняць таксама і азотныя. Аб атрыманых выніках дакладвалася як на беларускіх так і на ўсесаюзных канферэнцыях па рыбаводству. У бліжэйшы час будзе здан у друк спецыяльны зборнік, прысвечаны гэтаму пытанню і брашура, разлічаная на масавага чытата і практыкаў—рыбаводаў. Зробленыя намі рэкамендацыі прыняты Галоурыбпромам БССР для вытворчай праверкі, якая летам мінулага года была арганізавана пад нашай кансультацыяй у сажалкавай гаспадарцы Хотава і дала станоучыя вынікі, што было і адзначана на рэспубліканскай канферэнцыі рыбаводаў у канцы снежня.

Хоць у складзе выкладчыкау кафедры заалогіі няма спецыяліста-энтамолага, усё-ж нельга абыйсці маучаннем значную работу па вывучэнню насякомых-шкоднікаў сельскай гаспадаркі, якую актыуна вядуць члены студэнцкага энтамалагічнага гуртка, што працуе пры кафедры. Гэта аказваецца магчымым дзякуючы пастаяннаму кантакту з аддзелам абароны раслін Міністэрства сельскай гаспадаркі (заг. Т. Т. Бездзенка), у сістэме якога студэнты-энтамолагі праходзяць летнюю вытворчую і пераддыпломную практыку, непасрэдна удзельнічаючы у аператыунай барацьбе са шкоднікамі ў калгасах і соугасах у розных раёнах БССР.

Асобна трэба адзначыць цікавы вопыт правядзення дагаворнай работы сіламі студэнтау, які быў ажыццёулен пад кіраўніцтвам М. М. Драко летам 1955 года. У адказ на зварот Белпромсаюза былі арганізаваны тры партыі, якія даследвалі запасы промысловых малюскаў, прыгодных для гузікавай вытворчасці, у рэках Прыпяць, Нёман і Сож. Вынікі работы атрымалі станоучую адзнаку з боку Белпромсаюза.

Прафесар Г. Г. ВІНБЕРГ.

РОЛЯ ПРАКТЫКІ НА ГЕОЛАГА-ГЕАГРАФІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

На геалагічным аддзяленні геолага-геаграфічнага факультэта роля практыкі у засваенні студэнтамі вучэбнай праграмы адыгрывае выключна важную роль.

Пасля I—II курсау навучання студэнты пад кіраўніцтвам вопытных геолагау замацоўваюць у палявых умовах тэарэтычныя веды па геалагічнаму карціраванню і непасрэдна ўдзельнічаюць у складанні структурнай геалагічнай карты.

Гэта першы важны раздзел у падрыхтоуцы спецыялістау геолага-разведачнай справы.

Але найбольш адказным і ўсеабдымным цыклам вытворчага навучання з'яўляюцца першая вытворчая і пераддыпломная практыка. У гэты перыяд студэнты не толькі замацоўваюць атрыманыя тэарэтычныя веды па такіх вядучых дысцыплінах, як «Разведачнае бурэнне», «Асновы горнай справы», «Метады пошукаў і разведак карысных выкапняу» і інш., але адначасова атрымліваюць і першыя неабходныя навыкі у галіне арганізацыі і правядзення пошукау і разведак месцазнаходжанняў карысных выкапняу.

У час практыкі студэнты пазнаюць вытворчасць і шматгранае жыццё калектыву геолага-разведачных партый і экспедыцый.

Вытворчая і пераддыпломная практыка становіцца адным з рашаючых звенняу у справе падрыхтоукі высокакваліфікаваных спецыялістау.

У сувязі са змяненнем профілю спецыялізацыі некаторыя старыя базы вытворчай практыкі ужо не адпавядаюць новым запатрабаванням. Таму рэктарат універсітэта звярнууся ў Міністэрства вышэйшай адукацыі з просьбай прадаставіць магчымасць праводзіць першую вытворчую і пераддыпломную практыку ў партыях і экспедыцыях такіх геалагічных управленняу, як Уральскае і Цэнтральных раёнау і пашырыць колькасць месц у Поуночна-Заходнім і Заходне-Сібірскім управленнях.

Вытворчая практыка, такім чынам,—гэта працяг вучэбнага працэсу ў палявых умовах, і яна павінна быць строга праведзена ў рамках праграмы.

Нельга сказаць, што студэнты цяперашніх IV і V курсаў так і паступілі. Многія з іх «прасядзелі» калектарамі на адным з буравых камплектаў і не паспрабавалі пазнаёміцца з геолага-разведачным працэсам у цэлым. Рад студэнтау наогул не пажадалі убачыць вытворчасць і абмежаваліся простым перапісам геалагічных справаздач.

Дэканат геолага-разведачнага факультэта і вучэбная частка універсітэта павінны з усёй сур'ёзнасцю падыйсці да правядзення практыкі у бягучым годзе. Да падрыхтоукі правядзення летняй практыкі неабходна прыступіць ужо зараз і, у першую чаргу, даведацца пра базы правядзення практыкі і колькасць месц на гэтых базах. Гэта дазволіць своечасова размеркаваць практыкантау па аб'ектах, выдаць ім заданні. Гэта аблегчыць студэнтам падрыхтоўку да практыкі і несумненна павысіць узровень яе правядзення.

Д. М. КАРУЛІН,
загадчык кафедры пошукава-разведчай справы.

СУПРАЦЬ АБЫЯКАВЫХ АДНОСІН ДА ПАДРЫХТОЎКІ ЖУРНАЛІСТАЎ

Падрыхтоўка журналістаў праз завочны факультэт універсітэта мае вялікае значэнне у справе паляпшэння усёй дзейнасці нашага друку. Асабліва гэта важна ў цяперашні час, бо не так дауно многія раённыя газеты Беларусі перайшлі на павялічаны фармат, што адбілася на колькасці творчых работнікаў. Калі раней, напрыклад, у раённай газеце было толькі два чалавекі, то зараз там 10—і2 чалавек.

Вось чаму і завочны факультэт, і кафедра тэоры і практыкі партыйнага і совецкага друку павінны былі звярнуць асаблівую увагу на падрыхтоўку журналістау, зрабіць усё, каб наш друк атрымліваў высокаадукаваных, кваліфікаваных газетчыкаў.

Ці адпавядае становішча спраy гэтым задачам? Не. Калі меркаваць па таму кантынгенту, які зараз навучаецца у БДУ, многія студэнты-завочнікі пасля атрымання дыплому усё-ж журналістамі не стануць, наш друк не атрымае неабходнага папаўнення.

У чым прычына? Перш за усё, у няўмелым, няправільным падборы людзей, паступаючых на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта. Нашы прыёмныя камісіі часта адносяцца да падбору абітурыентаy з фармальнага пункту гледжання, выходзяць толькі з атрыманага бала. Між тым, наурад ці трэба лічыць правільнай такую сістэму прыёму. Відавочна, тут неабходна ў першую чаргу падыходзіць з пункту гледжання здольнасцей студэнта, яго літаратурных талентаy. Студэнт, які добра вывучыу усе дысцыпліны згодна праграмы, толькі тады будзе сапраудным журналістам, калі ў яго ёсць для гэтага неабходныя схільнасці.

Вельмі важна мець у ліку студэнтаy-завочнікаў людзей, працуючых ужо ў друку, але не маючых вышэйшай адукацыі.

Але, як ужо гаварылася, прыёмныя камісіі выходзяць з атрыманага бала. Гэта прывяло да таго, што цэлы рад студэнтаy вывучае тэорыю і практыку партыйнага друку, але ніякіх адносін да яго не мае.

Студэнт 3-га курса Эдуард Красоускі выконвае па службе абавязкі, якія вельмі далёкія ад друку. Што штурхнула яго паступаць на аддзяленне журналістыкі з аднымі «тройкамі» ў атэстаце—невядома, але нават кароткая заява з просьбай аб прыёме напісана ім такой непісьменнай мовай, што не цяжка было зразумець: журналіста з яго ніколі не атрымаецца. Тым не менш, ён быў прыняты.

Можна было меркаваць, што вучоба хоць колькі-небудзь дапаможа яму у авалоданні спецыяльнасцю журналіста. Але вось год назад Красоускі прысылае курсавую работу—рэцэнзію на раман «Маладая гвардыя» А. Фадзеева. Работа пападае у рукі выкладчыка і той пераконваецца, што яна слова ў слова спісана з рэцэнзіі Г. Владыкіна, змешчанай у часопісе «Большэвік» № і за 1952 год. Плагіят—наогул справа агідная, а калі гэтым займаецца будучы журналіст, то застаецца толькі рукамі развесці...

У час апошняй зімовай экзаменацыйнай сесіі Красоускаму давялося пісаць класную работу «Аналіз карэспандэнцыі». Пасля прагляду работы дацэнт М. С. Зярніцкі павінен быў напісаць: «Нездавальняюча. Здзіўляючая стылістычная непісьменнасць, ацэнкі карэспандэнцыі тут не існуе».

Такая кароткая, але вельмі выразная характарыстыка была выклікана рэдкай граматычнай неахайнасцю, тауталогіяй, адсутнасцю прасцейшых стылістычных увязак, грубым скажэннем цытат. Дастаткова сказаць, што ў гэтай «рабоце» у паутары старонкі з школьнага сшытку рэцэнзент зрабіў 25 правак.

Яшчэ прыклад. Пры падачы заявы з просьбай прыняць на завочнае аддзяленне універсітэта Міхаіл Паулюсюк, зараз таксама студэнт 3-га курса, так вызначыў свае дачыненне да журналістыкі:

«У восьмым класе палюбіу навуку на усё жыццё. Рашыу стаць навуковым работнікам. Паустала перада мною пытанне, у якім напрамку удасканальвацца. Самастойная работа у дзесятым класе над вывучэннем філасофіі і псіхалогіі дапамаглі мне вызначыцца. Выбраў спецыяльнасць па літаратуры (у атэстаце сталасці па літаратуры стаіць ацэнка «3»—В. Ш.) і паступіу у інстытут фізкультуры (!). Правучыуся тры гады...» Прычыны уходу з інстытута фізкультуры дыпламатычна апускаюцца, а далей ідзе просьба аб прыняцці яго на аддзяленне журналістыкі. Кантрольная работа на уступных экзаменах, якая складалася з некалькіх агульных абзацаy, задаволіла экзамінатара, а за дзве граматычных памылкі яму было пастаулена «4».

Так Паўлюсюк быу прыняты ва універсітэт, адначасова ён паступіу на работу загадчыкам ваенна-фізкультурнага аддзела райкома комсамола. Які будзе з яго журналіст, можна меркаваць па яго класнай рабоце на практычных занятках па спецыяльнасці у час апошняй зімовай сесіі. За дзве рабочыя гадзіны ён здолеу напісаць шэсць абзацаy агульнай колькасцю у 30 радкоу. Гэтыя абзацы можна свабодна мяняць месцамі, і ад гэтага работа не стане ні горш, ні лепш, таму што у ёй адсутнічае асноуная канва, няма ніякай увязкі паміж асобнымі думкамі. Затое тут вялікі набор такіх перлаy, як «Автор не плохо роскрыл поднимаемую тему», «Она (карэспандэнцыя—В. Ш.) носит оконкретный характер», «Указания ЦК КПСС на отрыв агитации и пропаганды от конкретной жизни коммунистического строительства» і г. д.

Наогул на трэцім курсе большасць студэнтаy не мае ніякіх адносін да прафесіі журналіста. Тут можна сустрэць лётчыкаy грамадзянскага флоту, комсамольскіх работнікаy, настаунікаy, супрацоунікаy Міністэрства унутраных спраy. Напрыклад, работнік упраулення міліцыі Мазанік ніколі у газеце не працаваў, на уступных экзаменах напісаy малапісьменнае сачыненне, а зараз з яго рыхтуецца газетчык. Толькі Зубкоу, памочнік паравознага машыніста станцыі Баранавічы, зразумеў, відавочна, што журналіста з яго не атрымаецца і... кінуў вучобу.

Паглядзім, што робіцца на другім курсе. Тут з 56 чалавек у газеце працуюць не больш 20. Студэнт Абрамкін працуе ў тэхнічным вучылішчы, Будзіка-ва—балярына, Яутуховіч—радыётэхнік і г. д. Больш палавіны студэнтаy у газеце зусім не працуюць і нічым сябе як будучыя журналісты не выяўляюць. У гэтых адносінах вельмі характэрная заява студэнткі Кандавінай, лётчыка ГПФ: «Калі перастану лятаць і перайду на пенсію, тады стану журналісткай». Як бачна, Кандавіна нават не разумее, што гэта ні якая-небудзь тэхнічная работа, якой можна заняцца у любы час.

Стаць добрым журналістам немагчыма без пастаяннай работы над сабой, без практычнага замацавання атрыманых ведаy. Як гавораць журналісты, неабходна пастаянна адточваць сваё пяро. Але вось студэнты 4-га курса Ойнас, Дробаy і іншыя да гэтага часу не маюць ніводнага друкаванага радка. Здавалася-б, што ад такіх студэнтаy не толькі патрабуюць прадстауляць друкаваныя работы, але і праходзіць практыку у газетах, як будучыя настаунікі праходзяць практыку у школе. Такая практыка прадугледжана вучэбнай праграмай. Аднак да гэтага часу завочны факультэт не звярнуу на такі пункт праграмы неабходнай увагі, што адмоуна сказаецца на падрыхтоуцы студэнтаy.

Як бачым, існуючая на завочным факультэце сістэма набору і падрыхтоукі журналістаy далёка не адказвае тым патрабаванням, якія прад'яуляюць рэдакцыі газет да заканчваючых універсітэт маладых работнікаy друку.

Сур'ёзным недахопам у падрыхтоуцы журналістаy трэба лічыць і слабыя патрабаванні да студэнтаy пры прыёме таго або іншага экзамену. Нікому не сакрэт, што экзамінатары заусёды робяць сур'ёзныя скідкі завочнікам: быццам, завочна вучыцца цяжка, лекцыйны курс невялікі, людзі прыходзяць з вытворчасці і г. д. Прычым гэта настолькі увайшло у сістэму, што вельмі рэдка нашы завочнікі рыхтуюцца у перыяд паміж сесіямі, а імкнуцца падрыхтаваць прадмет за дзень—два да экзамена. Да таго-ж, студэнты ведаюць, што выкладчык заусёды паставіць «пасрэдна», калі нават у студэнта нехапае ведаy і на гэтую адзнаку. У выніку узровень ведаy, атрыманых студэнтам-завочнікам, рэзка адрозніваецца ад узроуню ведау студэнта са стацыянара.

Падобны лібералізм, нажаль, існуе ў цэлага раду выкладчыкаy. Студэнты так прывыклі да гэтага, што дастаткова было загадчыку кафедры тэоры і практыкі партыйнага і совецкага друку дацэнту М. С. Зярніцкаму некалькі павысіць патрабаванні, як на яго паскардзіліся на завочны факультэт, а той-жа самы Красоускі паспрабаваy спачатку прымяніць да яго пагрозы, а потым пабег у дэканат з крыкам: «Ён мяне хоча заваліць!». Замест таго, каб даць адпор зарваушамуся хулігану, у дэканаце завочнага факультэта вырашылі, як сказаy намеснік дэкана тав. Скапцоу, скончыць справу «палюбоуна»... Няма чаго сказаць, прынцыповыя адносіны!

А між тым, патрабаванні да завочнікаy, асабліва да тых, хто у газеце не працуе, павінны быць не ніжэй, а вышэй звычайных патрабаванняy да студэнтаy стацыянара. Трэба падыходзіць з дзяржаунага, а не з вузка-дзяляцкага пункту гледжання, улічваць тую акалічнасць, што калі студэнт не з'яуляецца практыкам, ён павінен быць перш за усё высока падрыхтаваным тэарэтычна, што аблегчыць потым яму і практычную работу.

Дэканат завочнага факультэта і кафедра тэоры і практыкі партыйнага і совецкага друку павінны карэнным чынам перагледзець існуючае становішча з падрыхтоукай журналістаy і, у першую чаргу, з адборам кандыдатаy на аддзяленне журналістыкі. Кафедра павінна прымаць самы непасрэдны удзел у гэтай справе, выяўляць здольных да работы у друку людзей. Неабходна шырока арганізоуваць класныя работы, а дэканат павінен не пераводзіць на наступны курс студэнтаy, якія не маюць водгукаy або характарыстык рэдакцый аб іх рабоце або пройдзенай практыцы. Час ліквідаваць такую сістэму, калі асобных студэнтаy даводзяць да пятага або шостага курса, хоць ведаюць, што з іх сапраудных журналістаy не атрымаецца, а потым кажуць: не выключаць-жа іх зараз, няхай ужо заканчваюць! А над тым, што такі выпускнік не прынясе ніякай карысці рэдакцыі, і затрачаныя на яго велізарныя дзяржауныя сродкі сябе не апраудаюць, ніхто, звычайна, не задумваецца.

Дабіцца таго, каб завочны факультэт універсітэта выпускаy добра падрыхтаваных журналістаy, здольных з гонарам выконваць тыя пачэсныя задачы, якія ставіць перад друкам Камуністычная партыя—задача першаступеннай важнасці.

В. ШАЦІЛА.

ПІСЬМО У РЭДАКЦЫЮ

ЦІ БУДЗЕ У НАС ФОТАГУРТОК?

Гэта пытанне хвалюе усіх студэнтаy II курса аддзялення журналістыкі. Умець фатаграфаваць—адна з неабходных умоу паспяховай работы журналіста. Здавалася-б, гурток не так цяжка арганізаваць, патрэбен толькі вопытны кіраунік. На самай справе гэта пытанне да гэтага часу не вырашана. У першым семестры было некалькі заняткаy, але потым яны спынілісь, паколькі то выкладчык не прыходзіу, то не было аудыторыі. У сучасны момант становішча застаецца ранейшым: запісалі у гурток дауно, а аб ім, як гаворыцца, ні слуху, ні духу. Калі-ж, нарэшце, ён будзе арганізаван?

І. ШАМРЭЕВА.

Ведаць быт і запатрабаванні кожнага студэнта

Прафсаюзная арганізацыя універсітэта пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі за апошнія гады значна выраслa і умацавалася. Цяпер яна аб'ядноувае у сваіх радах больш трох тысяч членаў профсаюза.

Прафком і профсаюзныя бюро факультэтаў, профгрупы сталі больш цікавіцца бытам студэнтаў, сур'ёзна вырашаць пытанні вучобы і выхаваўчай работы. Дзякуючы дапамозе з боку партыйных арганізацый фізмата, біяфака, філфака, профсаюзныя арганізацыі гэтых факультэтаў праводзяць немалую арганізатарскую і выхаваўчую работу сярод студэнтаў.

Некалькі палепшылися за апошнія гады бытавыя умовы студэнтаў. Каля 1800 студэнтаў пражываюць у пяці інтэрнатах.

Сур'ёзную ўвагу удзяляе профсаюзная арганізацыя матэрыяльнаму становішчу членаў профсаюза. Толькі у мінулым годзе рэктаратам і прафкомам выдана студэнтам матэрыяльнай дапамогі каля 50 тысяч рублёў. Дзесяткі нашых студэнтаў штогод атрымліваюць пуцёўкі у санаторыі і дамы адпачынку.

Але трэба прызнаць, што узровень работы профсаюзнай арганізацыі не адпавядае патрабаванням сённяшняга дня. На адбыўшайся нядаўна XV профсаюзнай канферэнцыі дэлегаты ускрылі многа сур'ёзных недахопаў. У прыватнасці, адзначалася, што прафком яшчэ недастаткова чула і уважліва адносіцца да запатрабаванняў студэнтаў, мала займаецца вучобай профсаюзнага актыву, мала аказвае практычнай дапамогі у рабоце груп і г. д. Прафком прымае ўсе неабходныя меры да ліквідацыі ускрытых недахопаў.

Паспяховае вырашэнне задач, якія стаяць перад профсаюзнай арганізацыяй універсітэта, патрабуе актыўнай работы.

Важным звяном профсаюзнай работы з'яўляецца група. Трэба дабіцца таго, каб група стала цэнтрам выхаваўчай работы і будавала усю сваю работу з улікам асаблівасцей груп, індывідуальных якасцей кожнага студэнта. Прафорг павінен добра ведаць людзей сваёй групы, пастаянна цікавіцца іх вучобай, бытам, запатрабаваннямі.

Профсаюзнай арганізацыі яшчэ многае трэба зрабіць па паляпшэнню бытавых умоў студэнтаў. Значная частка пражываючых у інтэрнаце студэнтаў не забяспечана неабходнай маёмасцю. Дрэнна арганізавана харчаванне студэнтаў, забеспячэнне буфетаў і сталовай, якасць прыгатавання ежы пакідае жадаць многа лепшага. Прафком недастаткова патрабуе ад гаспадарнікаў ліквідацыі гэтых недахопаў.

Сур'ёзнага паляпшэння патрабуе пастаноўка культурна-масавай работы. Профсаюзныя групы і профбюро факультэтаў яшчэ мала удзяляюць увагі гэтаму пытанню. Нам патрэбна больш цікавая і часцей праводзіць вечары адпачынку, культпаходы, дыспуты, сустрэчы з артыстамі, пісьменнікамі, знатнымі людзьмі рэспублікі. Трэба дабіцца, каб вольны ад заняткаў час студэнт мог правесці цікава і карысна.

Усю сваю выхаваўчую і культурна-масавую работу профсаюзная арганізацыя павінна накіраваць на вырашэнне важнейшай задачы—аказанне дапамогі рэктарату і партарганізацыі у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Д. МАРЧАНКА,
старшыня прафкома БДУ.

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ

СПАБОРНІЦТВЫ ПА ЛЁГКАЙ АТЛЕТЫЦЫ

II сакавіка адбыліся унутрыфакультэцкія спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы у зімовых умовах. Лепшыя спартсмены спаборнічалі у бегу на 30 м, у прыжках у вышыню, даужыню, у штурханні ядра. На першым месцы па прыжках у даужыню і вышыню—А. Спірыдонаў (аддзяленне журналістыкі). Яго вынікі—155 см і 5,10 м. Сярод дзяўчат перамаглі Патапава—125 см. і Праташчык—3,60 (фізмат). У бегу на 30 м добры ч —4,2 паказаў Мінкевіч, студэнт ф зіка-матэматычнага факультэт Студэнт аддзялення журналістык Нікалаеў штурхануу ядро н 9,40 м. Гэта—лепшы вынік. Сярод дзяўчат першае месца заняла Ленковіч (фізмат), штурхнуушы ядро на 8,75 м.

Э. ГНЕДЗІНА.

Першынство фізмата па шахматах

У гэтыя дні ажыулена праходзіць шахматны турнір. У спаборніцтвах удзельнічаюць 40 мацнейшых шахматыстаў, склаушых 8 курсавых каманд. У кожную каманду уваходзяць 4 мужчыны і 1 жанчына.

Першай закончыла усе сустрэчы каманда I курса матэматыкаў, набраушая 24 ачкі. Асабліва паспяхова выступілі з гэтай каманды шахматысты Белы, Кудзін, Комлік і Эпштэйн. У добрай спартыунай форме знаходзяцца шахматысты 2 курса матэматыкаў Грудо, Афінадзенаў, Пятрышчэ. Дзякуючы іх зладжанай ігры, каманда займае высокае месца у турнірнай табліцы і да фініша можа паспрачацца з сваімі калегамі-першакурснікамі за першае месца.

Слаба падрыхтаванымі выступаюць шахматысты 4 курса аддз. фізікі. Чацверты курс матэматыкаў зусім не выставіу каманды.

Турнірам кіруе студэнт 3 курса аддзялення фізікі З. Ліушыц.

В. СЦЯПАНАЎ.

Агляд друку

ЦІ ТАКОЙ ПАВІННА БЫЦЬ ГАЗЕТА?

Вышаў чарговы нумар насценнай газеты юрыдычнага факультэта «Советский юрист». Цяжка сказаць, які гэта нумар па парадку, таму што ні нумара, ні даты выпуска газеты не указана.

Большасць матэрыялаў, змешчаных у газеце, прысвечаны вынікам зімовай экзаменацыйнай сесіі. Тое, што гэтае пытанне знайшло шырокае асвятленне на старонках факультэцкай газеты, вельмі важна. Шкада толькі, што у змешчаных матэрыялах сустракаецца рад недарэчнасцей, няудачных выразаў. У артыкуле «Коммунисты-студенты должны быть примером в учебе» падведзены вынікі сесіі у комуністаў факультэта. Комуністы, піша газета, «с возложенными на них задачами справились неплохо». Што-ж хаваецца пад словам «неплохо»? Здавалася-б, што аутар артыкула В. Вострыкаў (ён-жа галоуны рэдактар газеты) паведаміць аб тым, што усе комуністы здалі экзамены на «выдатна» і «добра». Ды не. Пад словам «неплохо» трэба разумець наступнае: з 43 комуністаў 11 здалі на «выдатна», 28—на «выдатна» і «добра», трое атрымалі здавальняючыя адзнакі, а студэнт трэцяга курса С. Андрэенка атрымаў адну здавальняючую і адну дрэнную адзнаку.

Як бачым, вынікі сесіі у комуністаў факультэта выклікаюць трывогу, але газета чамусьці лічыць, што сесію яны здалі «неплохо».

Каб не было сярод комуністаў «двоечников» і «троечников»,—заключае газета,—«необходимо **напряжение усилий (?!)** всех коммунистов факультета».

У гэтым-жа нумары надрукавана замалёўка аб лепшай студэнтцы факультэта Марыі Катлярovай, якая, нягледзячы на цяжкую хваробу, не толькі не адстае у вучобе ад сваіх сяброу, але і служыць ім прыкладам. У аснову замалёўкі узяты жывы факт. Нажаль, вычурнасць мовы, празмерны гіпербалізм робяць замалёўку нецікавай. Што можна сказаць, напрыклад, аб такім сказе: «Девушка, кажется, слилась в какой-то особенный сплав, что тверже алмаза, и беспощадно рубит щупальцы злодейки-болезни»?

Гэта не адзіныя прыклады. Падобныя сказы часта сустракаюцца у газеце. А іх можна было-б пазбегнуць, каб члены рэдкалегіі больш працавалі над змяшчаемымі матэрыяламі. Газета тады будзе карыстацца поспехам у чытача, калі яна будзе цікавай не толькі па зместу, але і па форме. Недапушчальна, каб у свет выходзіла газета са стылістычнымі памылкамі.

Што датычыцца граматычных памылак, то яны таксама сустракаюцца у газеце. Ці вядома рэдактару В. Вострыкаву, што слова «экзаминатор» пішацца праз «и», а не праз «е»?

Як недахоп у рабоце рэдкалегіі трэба адзначыць і тое, што палавіна матэрыялаў на старонках газеты з'яўляецца без подпісаў.

Б. МАНЦЭВІЧ.

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

„Ён павінен стаць сапраўдным грамадзянінам"

Пад такім загалоўкам у № 5 нашай газеты было змешчана пісьмо настаўніцы Хойніцкай СШ Л. Ф. Шахрай, у якім яна расказвала аб паводзінах В. Дашука, студэнта I курса аддзялення журналістыкі, у школе.

Камсорг I курса аддзялення журналістыкі Ю. Нікалаеў паведаміў рэдакцыі, што на курсе адбыўся комсамольскі сход, на якім было абмеркавана пісьмо настаўніцы Л. Ф. Шахрай.

Комсамольскі сход асудзіў паводзіны В. Дашука. Улічваючы яго просьбу, комсамольскі сход дазволіў Дашуку напісаць пісьмо т. Шахрай, якое будзе зачытана перад комсамольцамі курса.

Комсамольскі сход просіць камітэт комсамола БДУ расследаваць далей спарву В. Дашука, паколькі сход не мог вынесці пэўнага рашэння па гэтаму пытанню з-за адсутнасці дакладных фактаў.

„ЖУРНАЛІСТЫ ПАВІННЫ БОЛЬШ ПІСАЦЬ"

У № 1 «Беларускага універсітэта» быў змешчан матэрыял пад такім загалоўкам.

Загадчык кафедры тэорыі і практыкі партыйнага і совецкага друку дацэнт Зярніцкі паведаміў рэдакцыі, што заметка абмяркоувалася на пасяджэнні кафедры тэорыі і практыкі партыйнага і совецкага друку. Факты, выкладзеныя ў заметцы, прызнаны правільнымі.

Адносна-ж патрабавання аўтара заметкі дацэнта Фактаровіча аб тым, каб залік па друку зарубежных краін у студэнтаў V курса складаўся з вуснага апытання і пісьмовага агляду, кафедра мяркуе, што залік мэтазгодна абмежаваць адным з указаных вышэй патрабаванняў: вуснага апытання або напісання агляду.

ЗАГЛЯНЕМ У КАБІНЕТЫ І ЛАБАРАТОРЫІ

„ДАЙЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, ТЭРМОМЕТР"

Хімічны факультэт павінен мець добра абсталяваныя лабараторыі для практычных заняткаў і навукова-даследчай работы. Але ці так абстаіць справа у сапраўднасці, ці усім неабходным забяспечаны лабараторыі, ці створаны нармальныя умовы для заняткаў у іх? Спытаем аб гэтым тых, хто працуе у лабараторыях.

Кандыдаты навук А. І. Чырко і В. В. Свірыдаў расказалі аб цяжкасцях, якія перашкаджаюць нармальнай працы лабараторыі кафедры каталіза.

Вялікую нязручнасць выклікае недахоп месца: у адным памяшканні часта даводзіцца працаваць і студэнтам, і аспірантам, і навуковым работнікам. З-за недахопу месца навуковыя работнікі, якія займаюцца у лабараторыі ў дзве змены, вымушаны здымаць са сталоў пастаўленыя ў час папярэдняй змены прыборы і прэпараты і замяняць іншымі, неабходнымі для работы. Такія «уборкі» адымаюць вельмі многа часу. Нехапае месца для гуркоуцаў.

Многія цяжкасці могбы прадухіліць невялікі пакойчык для двух трох навуковых работнікаў.

Далёка не усё добра і з абсталяваннем. Хутка прыдзецца вывучаць нафту, атрымліваць яе складаныя часткі. А гэта немагчыма без калонкі для фракцыяніравання. Такой калонкі у лабараторыі няма. Неабходна набыць вакуумныя насосы, якія дазвалялі-б аддзяляць складаныя часткі нафты пры параунауча малых тэмпературах. Для атрымання кісларода патрэбны сілеавыя выпраміцелі току. Лабараторыя мае патрэбу ў рэле, неабходных для падтрымання пастаяннай тэмпературы ў тэрмастатах.

Безумоўна, многія з гэтых прыбораў набыць нялёгка. Сродкі, выдзеленыя для кафедры ў гэтым навучальным годзе, недастатковыя для забеспячэння яе патрэб.

Але нярэдка бывае, што прыбораў або прэпаратаў нехапае па віне забеспячэнскіх органаў. Недаравальныя выпадкі адсутнасці самых неабходных рэактываў. У лабараторыі няма бензолу. Дарэчы сказаць, на гэта скардзяцца работнікі усіх лабараторый факультэта. Здараюцца сапраўды «цікавыя» рэчы: з-за недахопу сернай кіслаты за ёй едуць у Акадэмію навук БССР. Бываюць выпадкі, калі у лабараторыях адсутнічаюць саляная і азотная кіслоты. Работнікі лабараторый вымушаны самі займацца вырабам нехапаючых рэактываў.

На кафедры фізічнай і калоіднай хіміі старшая лабарантка Е. М. Квач адразу паскардзілася на недахоп памяшкання і вельмі здзівілася, пачуўшы, што гэта звычайная скарга:

—Зусім не звычайная. У нас палавіна лабараторыі выдзелена для студэнтаў. Дзесяць разоу у тыдзень па 6 гадзін займаюцца тут чацверакурснікі. І толькі 12 гадзін у тыдзень могуць займацца у лабараторыі студэнты-гурткоуцы і дыпломнікі. Рабочых месц нехапае. А што будзе у наступным годзе, калі колькасць студэнтаў, якія займаюцца у нашай лабараторыі, павялічыцца больш чым на 70 чалавек? Нам патрэбны яшчэ дзве лабараторыі.

Але гэта не усё. У нас няма майстэрні, дзе можна было-б рамантаваць абсталяванне па фізічнай хіміі, а яно-ж не вечнае. Зараз у лабараторыі няма шчолачаў. За тэрмометрам у 500 градусаў трэба хадзіць у лабараторыю каталіза і прасіць: «Дайце, калі ласка, тэрмометр, праз мінуту прынясем». Нехапае і дакладных тэрмометраў Бекмана. Наогул, многага няма па віне гаспадарчай часткі.

Так, гаспадарчая частка вінавата у многім. На факультэце добра памятаюць «кампанію за цягу», якая працягвалася 8 гадоу. І толькі у верасні мінулага года цяга пачала працаваць. Нарэшце-ж перасталі скаплівацца у лабараторыях шкодныя і дрэннапахучыя рэчывы. Але к новаму году цяга сапсавалася. Поумесяца назад яе адрамантавалі — будзем спадзявацца, што канчаткова. Рубільнік цягі змянілі магнітным уключальнікам. Нават і перанеслі з гары на другі паверх. Цяпер ужо не трэба супрацоунікам лабараторыі па вечарах падымацца на гару і у цемры шукаць рубільнік, каб выключыць цягу.

У лабараторыі фізічнай і калоіднай хіміі займаўся студэнт-дыпломнік М. Гілевіч. На пытанне аб умовах работы ён адказаў:

— Цяпер я працую у параунауча добрых умовах, але калі прыдуць з практыкі студэнты 4-га курса, давядзецца «пацясніцца». Увогуле, месца у лабараторыі вельмі мала.

— А як вы забяспечаны рэактывамі?

— Не вельмі добра. Часта неабходных рэактываў не бывае. Зараз, напрыклад, няма шчолачаў, прапёнавай кіслаты, нітрабензолу.

У адной з лабараторый мы сустрэлі дэкана факультэта І. Г. Цішчанку. Ён сказаў:

— Многа цяжкасцей стварае дрэнна пастаўленая забеспячэнская работа. На факультэце часта не бывае неабходных прыбораў і рэактываў. Таму заняткі зачастую праходзяць нецікава.

На патрэбы факультэта адпушчана у гэтым годзе усяго 20.000 рублёў. А адзін спектрафатометр ІКС-11 каштуе 90.000 рублёў. Зразумела, што недахоп сродкаў перашкаджае набыць многія неабходныя прыборы.

Нехапае установак для рэнтгена - структурнага аналізу, мікрааналізу арганічных злучэнняў, вымяральнай апаратуры, няма установак для работы з «мечанымі атамамі», не гаворачы ужо аб такіх дарагіх прыборах, як спектрафатометры. А ўсё гэта неабходна для навукова-даследчай работы і для заняткаў са студэнтамі.

У КАБІНЕЦЕ ГЕАДЭЗІІ І КАРТАГРАФІІ

У кабінеце геадэзіі і картаграфіі праводзіцца рад каштоуных работ і даследаванняў. Тут рэгулярна арганізуюцца кансультацыі, вывешан спіс неабходнай літаратуры, маюцца патрэбныя кнігі, карты і іншыя дапаможнікі.

Аднак часта здараюцца перабоі у рабоце з-за недахопу прыбораў, інструментаў і нерэгулярнага забеспячэння матэрыяламі. У кабінеце маецца адзін анероід, а для поунацэннай работы іх патрэбна самае малае 10. Няма таксама планшэтаў вакамернай з'ёмкі, бываюць часта перабоі з дастаўкай чарцежнай паперы.

Прайшло ужо больш года, як кабінет звярнуўся у гаспадарчую частку з заказам на самы неабходны інструмент—нівеліраваныя лейкі, аднак іх і да гэтага часу няма. Не выдзяляецца грошай на набыццё чарцёжных інструментаў, на пабудову кладовай геадэзічных інструментаў, на афарбоуку сталоу. А гэта-ж усё адмоўна адбіваецца на рабоце студэнтаў.

У ЛАБАРАТОРЫЯХ ГЛЕБАЗНАЎСТВА

Не ўсё добра з абсталяваннем і памяшканнем для лабараторыі і на біёлага-глебавым факультэце. У двух лабараторыях займаюцца амаль усе студэнты, а у першым семестры праводзілі доследы яшчэ і студэнты геафака. Вядома, вельмі цесна. Таму большасць студэнтаў V курса працуюць у лабараторыях Акадэміі навук, хаця у пяцікурснікаў ёсць свая лабараторыя. А калі згадзіцца, што ў цеснаце не ў крыудзе, то для правядзення доследаў нехапае патрэбных прыбораў, напрыклад, патэнцыёметра—прыбора для вызначэння кіслотнасці глебы. Кафедра мае каштоуныя экспанаты асноўных зямельных зон, але іх няма куды размясціць. «Таму,—гаворыць старшы выкладчык В. І. Пашын,—з'явілася неабходнасць у невялікім музеі, дзе-б студэнты змаглі паглядзець, аб чым ім цяпер даводзіцца расказваць па малюнках, а то і проста на веру.»

Усё-ж нельга не улічваць гэтыя просьбы, зыходзячы хаця-б з таго, што кафедра глебазнаўства рыхтуе спецыялістаў, якім неабходны трывалыя веды.

З такім становішчам нельга мірыцца. Трэба даць лабараторыям усё неабходнае, каб забяспечыць нармальныя умовы для работы студэнтаў і навуковых работнікаў.

А. СЦЕПАНЕНКА,
Б. ФРАЛОЎ.
А. СІЛЕНКОЎ.
Н. ЧАЙКА,
Ф. САВІЦКІ.

Рэдактар А. ВОЛК.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, пакой62, тэл. 2-07-19

АТ 02951 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 328. Тыраж 2000.